# ВЫСТУПЛЕННЕ К. В. КІСЯЛЕВА НА ПРЭС-КАНФЕРЭНЦЫІ У САН-ФРАНЦЫСКА

САН-ФРАНЦЫСКА, 23 мая. **(Спец. кар. ТАСС).** Старшыня Беларускай дэлегацыі на канферэнцыі Аб'яднаных нацый тав. К. В. Кісялёў выступіў 23 мая на прэс-канферэнцыі ў Сан-Франциска з заявай аб Беларускай ССР, пасля чаго адказаў на пытанні карэспандэнтаў. У заяве тав. Кісялёва гаворыцца:

«Нашу першую прэс-канферэнцыю я намеціў прысвяціць азнаямленню прадстаўнікоў друку з рэспублікай, якую прадстаўляе наша дэлегацыя на канферэнцыі ў Сан-Франциска.

Беларусь — краіна з 10-мільённым насельніцтвам, знаходзіцца на вярхоўях рэк Днепра, Заходняй Дзвіны, Нёмана і іх прытоках. Яна займае 225 тысяч квадратных кілометраў і па тэрыторыі значна больш такіх еўрапейскіх дзяржаў, як Бельгія, Швейцарыя і Галандыя. Сталіцай Беларусі з'яўляецца горад Мінск.

Тэрмін «Беларусь» упершыню сустракаецца ў XIV веку і з XIV века атрымлівае шырокае распаўсюджанне сярод суседніх народаў. Паходжанне самой назвы «Беларусь» трактуецца розна. Абумоўлена яно, як відаць, геаграфічнымі і этнаграфічнымі фактарамі. У якасці прыкладу можна ўказаць, што ў мінулым нацыянальная вопратка амаль усіх беларусаў была белага колеру.

У многіх афіцыяльных дакументах і газетах слова «Беларусь» перакладаецца як «Уэйт Раша». Гэта няправільна. Неабходна пісаць так: «Беларашэн Совьет Сопыяліст Рыпаблік».

Да рэвалюцыі ў Беларусі большасць насельніцтва было непісьменным. У нашы дні ў краіне поўнасцю ліквідавана непісьменнасць. У рэспубліцы налічваецца 26 вышэйшых навучальных устаноў, 41 навукова-даследчы інстытут, Акадэмія Навук, Універсітэт. За гэтыя годы створана 20 прафесіянальных драматычных тэатраў. Сярод іх выдатны калектыў Дзяржаўнага тэатра оперы і балета. Створаны дзяржаўная кансерваторыя, музычныя школы і вучылішчы, Дзяржаўная карцінная галерэя, свая кінематаграфія і паліграфія. З асяроддзя беларускага народа выйшлі такія выдатныя паэты як Янка Купала і Якуб Колас.

У чэрвені 1941 года гітлераўскія полчышчы раптоўна напалі на Савецкі Саюз. Беларусь адной з першых савецкіх рэспублік прыняла на сябе ўдар вераломнага ворага. Нямецкія людаеды замучылі (расстралялі, павесілі, умярцвілі ў душагубках, спалілі жыўём і г. д.) 800 тысяч чалавек беларускага насельніцтва, у большасці сваёй жанчыны, старыя і дзеці. Яўрэйскае насельніцтва, якое заставалася ў акупіраванай немцамі Беларусі, амаль поўнасцю знішчана, што складае арыентыровачна каля 400 тысяч чалавек. 300 тысяч чалавек былі вывезены ў Германію на фашысцкую катаргу. Нямецкія варвары разбурылі беларускія гарады: Мінск разбуран на 80 працэнтаў, Віцебск—на 90 працэнтаў, Гомель — на 80 працэнтаў, Орша амаль поўнасцю знішчана; спалены многія вёскі, знішчана больш 300 тысяч жылых

ву барацьбы за працяглы мір і ўсеагульную бяспеку свабодалюбівых нацый. Мы выказваем надзею, што пры супрацоўніцтве другіх міралюбівых народаў гэтая мэта будзе дасягнута».

Пасля заявы тав. Кісялёў адказваў на шматлікія пытанні карэспандэнтаў, большасць якіх асабліва цікавілася самастойнасцю знешняй палітыкі Беларускай рэспублікі, а таксама адносінамі беларускага ўрада да Польшчы і да канферэнцыі ў Сан-Франциска. Каментыруючы пазіцыю Беларускай дэлегацыі на канферэнцыі, тав. К. В. Кісялёў указаў, што беларуская дэлегацыя падтрымлівае рашэнні канферэнцыі ў Думбартон-Оксе, а таксама папраўкі чатырох дзяржаў да Думбартон-Окса.

Адказваючы на пытанні аб самастойнасці Беларусі ў замежных справах, тав. Кісялёў падкрэсліў, што Беларусь з'яўляецца абсалютна самастойнай у знешніх адносінах. Адзін карэспандэнт папрасіў растлумачыць, якая ступень і прызнакі аўтаноміі Беларускай рэспублікі. Тав. Кісялёў паясніў, што Беларуская Савецкая рэспубліка валодае поўнай самастойнасцю, таму што яна мае свой Вярхоўны Савет, Урад, Народны Камісарыят Замежных Спраў, хутка будзе мець сваю армію і Камітэт Абароны. Беларуская рэспубліка ў сваіх знешніх адносінах з'яўляецца самастойнай на аснове рашэння Вярхоўных Саветаў СССР і БССР.

Адказваючы на пытанне аб адносінах Беларусі да Польшчы і польскага ўрада ў Варшаве, тав. Кісялёў адзначыў, што

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы